# Адаптацыю лясной гаспадаркі да змянення клімату абмяркуюць у БДТУ

*07.02.2018 13:16*

**8 лютага ў рамках праекта Сусветнага банка "Развіццё лясного сектара Рэспублікі Беларусь "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт прэзентуе праграму "Стратэгія і планы дзеянняў па адаптацыі лясной гаспадаркі Беларусі да змянення клімату, павелічэння абсорбцыі парніковых газаў, укаранення прынцыпаў "зялёнай эканомікі".**

Трэба зазначыць, што праблемы змянення клімату набываюць апошнім часам пагрозлівыя формы. Пасоўванне тэрмінаў пачатку вясенніх працэсаў, павелічэнне працягласці вегетацыйнага перыяду, рост максімальных тэмператур і павелічэнне колькасці пажаранебяспечных дзён, зніжэнне ўстойлівасці насаджэнняў з-за недастатковай забяспечанасці вільгаццю ў вегетацыйны перыяд, масавае развіццё хвароб і размнажэнне шкоднікаў, якія знішчаюць лясы і пасевы — вось няпоўны пералік найбольш значных наступстваў змянення клімату на планеце. А павелічэнне плошчы лясоў лічыцца найбольш эфектыўным спосабам па іх змякчэнні.

Падчас прэзентацыі і правядзення чатырох круглых сталоў плануецца абмеркаваць надзённыя праблемы лясоў у Еўропе і агульнаеўрапейскія падыходы па адаптацыі лясной гаспадаркі да кліматычных змяненняў. Будуць прадстаўлены актуалізаваная Стратэгія адаптацыі лясной гаспадаркі да змянення клімату і праект Стратэгіі Нацыянальнага плана па ўкараненні прынцыпаў "зялёнай эканомікі" у лясную гаспадарку да 2030 года.

У мерапрыемстве прымуць удзел кіраўнік Прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Рэспубліцы Беларусь Алекс КРЭМЕР, першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК, прадстаўнікі дыпламатычных місій замежных дзяржаў, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, навуковых і грамадскіх арганізацый.

Інфармацыйныя матэрыялы, даклады і праграму мерапрыемства можна знайсці тут.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

Навіны Папулярнае
09:47 У Беларусі павышаюцца цэны на аўтамабільнае паліва
09:31 У Лондане сотні пасажыраў эвакуіраваны з цягніка, які загарэўся (фота)
08:02 Прагноз надвор'я на 8 лютага
21:45 МАК мае намер правесці ў Сенегале юнацкія Алімпійскія гульні 2022 года
20:00 Ала Цупер стане сцяганосцам зборнай Беларусі на адкрыцці Алімпіяды
УСЕ НАВІНЫ

## Чытайце таксама

- Ад чаго пакутуюць беларускія балоты
- Чаму важна беражліва ставіцца да навакольнага асяроддзя
- У лясгасах Беларусі вядзецца нарыхтоўка шышак елкі і сасны
- На варце прыродных багаццяў
- Мінпрыроды заклікае ўсіх далучыцца да навядзення парадку на зямлі

Тэгі: Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | лясная гаспадарка | экалогія

134 праглядаў Друкаваная версія

Падзяліцца:

## Дадаць каментар

**Вашае імя**

**Каментарый ***

Я не робот

reCAPTCHA

Канфідэнцыяльнасць - Умовы выкарыстання

✔ ЗАХАВАЦЬ

## Выбар рэдакцыі



Грамадства

### Гісторыя жанчыны, якая прайшла нарказалежнасць і калонію

Калі хочаш змяніцца — шукай магчымасці.

0 127



Эканоміка

### Ці плануецца пашыраць магчымасці электроннага дэкларавання даходаў?

Якія даходы неабходна дэклараваць? Як атрымаць падатковую льготу?

0 188



Грамадства

### Як медыцынскі псіхолаг перакваліфікаваўся ў пекара сямейнай піраговай

Сям'я — сёння самае дарагое, што ёсць у таты траіх дзяцей.

0 85



Грамадства

### Чаму нам трэба павышаць узровень прававой культуры ў сферы IT

Праваахоўнікі канстатуюць рост кіберзлачыннасці ў краіне.

0 193


Нашы партнёры:

ЗВЯЗДА

ПАДПІСКА





1 231
506
483

© 1998—2018 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ "Выдавецкі дом "Звязда".
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Создание сайта
Обслуживание сайта